третьих, для успеха в первых двух ипостасях необходимо повышать общий уровень образованности населения, ибо только в этом случае знания смогут превращаться в действенный фактор прогресса всего населения (ставка на использование отдельных групп интеллектуалов в океане безграмотных людей неминуема обречена на провал).

Таким образом успешное формирование общества знаний возможно только при реализации «стратегии максимизации образования», суть которой заключается в приоритете усилий общества, направленных на опережающее развитие сфер образования, науки и здравоохранения.

В качестве первого на этом пути шага в самое ближайшее время образование, здравоохранение и наука должны быть переведены в сферу производства – производства человека новой формации, причем затраты на эти сферы должны быть отнесены к актуальным инвестициям, а не рассматриваться в виде обременений бюджета.

Следовать этому императиву должным образом можно только в том случае, если работниками всех уровней сферы образования будут специалисты, по характеру своей деятельности выступающие в качестве ученых-практиков: постоянно самообразовывающихся, находящих и внедряющих новое, стремящихся обеспечить более качественное исполнение своих обязанностей и одновременно отвечающих за результаты своей работы.

ЛИТЕРАТУРА

1. Маркс, К. Немецкая идеология / К. Маркс, Ф. Энгельс. – М.: Политиздат, 1988.- 589 с.
2. Воронов, М.В. Трансформация культуры / М.В. Воронов // трансформация цивилизации /Альтернативы коммерциализации и бюрократизации образования, науки и культуры: [монография]; под редакцией Н.Г. Яковлевой. – М.: Культурная революция, 2019. – С. 294 – 301.
3. Строков, А.А. Цифровизация образования: проблемы и перспективы / А.А. Строков // Вестник Минского университета, 2020. – Том.8, №2. – С.15–28.
4. Бодрунов, С.Д. Ноономика / С.Д. Бодрунов: [монография]. – М., Культурная революция, 2018. – 432с.

УДК 378 (06)

## СУЧАСНАСЦЬ ПАЧЫНАЕЦЦА Ў МІНУЛЫМ: ПЕРШЫЯ ВЫПУСКНІКІ ГРОДЗЕНСКАГА СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАГА ІНСТЫТУТА1955 г.

**В.У. Галубовіч, В.П. Галубовіч**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт» (Рэспубліка Беларусь, 230008, г. Гродна, вул. Церашковай, 28; e-mail: ggau@ggau.by)



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Анатацыя. У артыкуле прадстаўлены вынікі рэканструкцыі калектыўнага партрэта першых выпускнікоў Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута 1955 г.
Ключавыя словы: адукацыя, сельская гаспадарка, студэнт, універсітэт.

## НАСТОЯЩЕЕ НАЧИНАЕТСЯ В ПРОШЛОМ: ПЕРВЫЕ ВЫПУСКНИКИ ГРОДНЕНСКОГО СЕЛЬСКОХОЗЯЙСТВЕННОГО ИНСТИТУТА 1955 г.

**В.В. Голубович, О.П. Голубович**
УО «Гродненский государственный аграрный университет» (Республика Беларусь, 230008, г. Гродно, ул. Терешковой, 28; e-mail: ggau@ggau.by)
Аннотация. В статье представлены результаты реконструкции коллективного портрета первых выпускников Гродненского сельскохозяйственного института1955 г.
Ключевые слова: образование, сельское хозяйство, студент, университет.

## PRESENT BEGINS IN PAST: THE FIRST GRADUATES OF GRODNO AGRICULTURAL INSTITUTE, 1955

**V.U. Halubovich, V.P. Halubovich**
EI «Grodno State Agrarian University» (Grodno, 230008, 28, Tereshkova st.; e-mail: ggau@ggau.by)
Summary. The article presents the results of the reconstruction of the collective portrait of the first graduates of Grodno agricultural institute.
Key words: education, agriculture, student, university.

Пачатковыя старонкі гісторыі ўтворанага ў 1951 г. Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута знайшлі свае адлюстраванне ў некалькіх публікацыях [1, с. 8; 2, с. 43], аднак панарамная карціна таго, што адбывалася ў першыя гады існавання ўстановы, дагэтуль не вельмі выразная. З аднаго боку, гэта вынік абмежаванасці крынічнай базы, з іншага – наступства фрагментарнага выкарыстання нават даступных звестак, у тым ліку архіва навучальнай установы. Вышэйшая школа, як вядома, складаецца з двух кампанентаў– выкладчыкаў і студэнтаў. Галоўным прадуктам дзейнасці ВНУ з'яўляюцца выпускнікі, якія самі па сабе ўяўляюцца невыпадковым чалавечым матэрыялам, людзьмі з рознымі, часам складанымі, лёсамі. Уласна такімі былі першыя гадаванцыГСГІ, якія атрымалі дыпломы ў 1955 г. На шчасце, наяўны архіўны матэрыял дазваляе правесці рэканструкцыю калектыўнага



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

партрэта студэнтаў, з якімі прыйшлося працаваць першым выкладчыкам ГСГІ[3].

Навучальны працэс у інстытуце пачаўся на некалькіх факультэтах. Гэта былі першы і другі курсы заатэхнічнага і агранамічнага факультэтаў. Паколькі адразу ў 1951 г. сфармаваліся групы другога курса, то першы выпуск адбыўся ўжо праз чатыры гады пасля заснавання ўстановы. На падставе загада па ГСГІ № 49 ад 3 красавіка 1955 г. дыпломы былі выдадзены 10 заатэхнікам і 12 аграномам, якія вытрымалі Дзяржаўны іспыт і мелі станоўчае рашэнне Дзяржаўнай кваліфікацыйнай камісіі. Спіс першых выпускнікоў не з'яўляецца таямніцай, але за кожным прозвішчам хаваецца біяграфія чалавека, якому выпала перажыць складаныя часы і пераломныя падзеі XX ст. Сістэматызаваныя даступныя звесткі пра выпускнікоў дазваляюць зрабіць абагульненні па шэрагу наступных пазіцый.

***Узрост.*** Большая частка выпускнікоў 1955 г. была прыблізна аднаго ўзросту, што не стварала перашкод для міжасабовай камунікацыі. 18 з 22 асоб былі народжаныя на працягу 1927-1931 г., а найбольш (сем) былі 1931 года нараджэння. Самым дасведчаным выпускніком 1955 г. быў І.Я. Ігнаценка, які атрымаў дыплом прыблізна на 42 годзе жыцця (інфармацыі пра дзень нараджэння няма).

***Этна-сацыяльны склад.*** Нацыянальны склад студэнтаў-выпускнікоў 1955 г. быў даволі стракатым і адпавядаў у цэлым геаграфіі размяшчэння ГСГІ. Беларусы складалі толькі палову з 22 асоб, не на шмат ім саступалі рускія, якіх было ажно восем. Палякамі назваліся два выпускніка, і адна асоба была ўкраінкай па нацыянальнасці.

Большая частка выпускнікоў у аўтабіяграфічных звестках паведамляла пра сваё сацыяльнае паходжанне. Пераважна студэнты паходзілі з сельскай мясцовасці, а іх бацькі займаліся сельскай гаспадаркай. Некаторыя рабілі акцэнт на бядняцкім паходжанні, што ў тагачасных умовах было спрыяльнай і станоўчай акалічнасцю. Аднак былі і такія (прычым толькі рускія), хто паходзіў з сямей служачых ці рабочых, фактычна вырас у горадзе.

***Геаграфія паходжання.*** ГСГІ ствараўся як рэгіянальны цэнтр падрыхтоўкі кадраў для народнай гаспадаркі, але ў Гродна прыехалі вучыцца ахвочыя з самых розных мясцовасцей. Звяртае на сябе ўвагу той факт, што ўласна ўраджэнцаў Гродзеншчыны ў сучасным сэнсе сярод выпускнікоў 1955 г. было толькі тры. Геаграфічна Беларусь была прадстаўлена выхадцамі з Баранавіцкай, Магілёўскай, Гомельскай, Мінскай і Віцебскай абласцей. Студэнты рускія па нацыянальнасці паходзілі з Ленінградскай, Бранскай, Смаленскай, Горкаўскай,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Калінінскай і Растоўскай - на - Доне абласцей. З Украіны паходзіла Сапітон М.П. Цікавы лёс быў у Н.Р. Тамчук, беларускі па нацыянальнасці, якая нарадзілася на тэрыторыі Беластоцкага ваяводства і пражывала ў Польскай Рэспубліцы да 1946 г. (вучылася ў гімназіі горада Бельска), але ў жніўні 1946 года разам з бацькамі перасялілася ў Гродна.

***Геаргафія навучання да пераводу ў ГСГІ.*** На другі курс інстытута ў 1951 г. залічваліся амаль выключна тыя асобы, якія мелі сярэднюю адукацыю і папярэдні вопыт профільнага навучання ў вышэйшай школе. Галоўным пастаўшчыкам студэнтаў для другога і наступных курсаў заатэхнічнага і агранамічнага факультэтаў была Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія ў г. Горкі Магілёўскай вобласці. З выпускнікоў ГСГІ 1955 г. ажно 15 чалавек вучыліся на заатэхнічным, агранамічным і плодаагароднiцкім факультэтах БСГА. Усе яны, відавочна, ведалі адзін аднаго, паколькі паступілі на першы курс у 1950 г. (уключаючы завочніка Шаршнёва К.А.). Масавы, калі так можна сказаць, перавод з БСГА у ГСГІ адбыўся ў 1951 г, але некаторыя студэнты перавяліся пазней, у 1952-1953 гг.

Акрамя БСГА, працягнуць адукацыю ў Гродна вырашылі студэнты некаторых іншых ВНУ РСФСР і УССР: Горкаўскага, Херсонскага і Ленінградскага сельскагаспадарчага інстытутаў, Валагодскага малочнага інстытута. Кур’ёзам выглядае гісторыя са старэйшым выпускніком 1955 г. І.Я. Ігнаценкам, які на момант залічэння на аграфак меў досвед завочнага навучання толькі на гістарычных аддзяленнях педагагічных устаноў.

***Прычыны пераводу ў ГСГІ.*** Заснаванне сельскагаспадарчага інстытута ў Гродна давала шансы мясцовай моладзі набыць вышэйшую адукацыю. Для многіх перавод у ГСХІ быў абумоўлены матэрыяльнымі і асабістымі абставінамі. Некаторыя выкарыстоўвалі магчымасць атрымаць дыплом не ад’язджаючы далёка ад месца пражывання. Былі і такія, хто вельмі абачліва сцвярджаў пра жаданне вучыцца ў інстытуце з мэтай набыцця высокай кваліфікацы для наступнай працы на карысць “сацыялістычнай сельскай гаспадаркі” і “служэнню партыі, справе Леніна і Сталіна”. На матывацыю асобных студэнтаў уплывалі іх асабістыя “дасягненні”. Так, несумненна, што навучанне ў ГСГІ для Іванова А.С. было другой спробай атрымаць дыплом агранома пасля адлічэння за непаспяховасць з Ленінградскага сельскагаспадарчага інстытута.

***Лідары і аўтсайдэры***. Выпускнікі 1955 г. падавалі дакументы ў ГСГІ з абавязковай даведкай аб выніках навучання ў сваіх інстытутах. Наяўныя ведамасці сведчаць, што ў ГСГІ пераводзіліся студэнты з



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

самым розным спектрам дасягненняў у вучобе, у тым ліку з поўным (!) камплектам *выдатных адзнак па ўсіх здадзеных прадметах* (напр., С.І. Тузаў, В.А. Багданава). Пераважна "на выдатна" скончыў навучанне ў БСГА студэнт Захарэвіч В.А., які засведчыў здольнасці да навучання яшчэ ў тэхнікуме, які скончыў круглым (!) выдатнікам. За поспехі ў навучанні Захарэвіч В.А. быў нават прадстаўлены да сталінскай стыпендыі, а першы дэкан аграфака В.А. Кумакоў рэкамендаваў пакінуць яго для навукова-педагагічнай працы ў інстытуце. Але былі і антыгероі, паводзіны якіх, як і навучанне, выклікалі адпаведную рэакцыю дырэкцыі. Асабліва ў гэтым кірунку "праславіўся" Іваноў С.А., на рахунку якога былі як задавальняючыя поспехі ў вучобе, так і зарэгістраваныя грубіянскія паводзіны ў адносінах да выкладчыкаў, пропускі заняткаў, п'янкі, дракі, факты вымагання грошай ды здзекаў са студэнтаў, што стала прычынай яго неаднаразовага высялення з інтэрната.

***Людзі вайны.*** Для большай часткі выпускнікоў 1955 г. Другая сусветная вайна прыйшлася на гады малалецтва. Ім прыйшлося ўбачыць жахі вайны, самім удзельнічаць у змаганні з ворагам. З-за вайны многія былі вымушаны перапыніць навучанне ў школе і фактычна выжываць з бацькамі на акупаванай немцамі тэрыторыі. Гэтыя людзі ведалі кошт вайны. Так, Шаршнёў К.А. у аўтабіяграфіі адзначаў, што на вайне загінулі тры яго браты. Сярод першых выпускнікоў былі і ўдзельнікі вайны. Медсястрой у вайсковым шпіталі з 1941 г. працавала В.Я. Багданава. З 1941 г. па 1951 г. у шэрагах савецкай арміі быў згаданы І.Я. Ігнаценка.

**Табліца. 1. Паіменны спіс выпускнікоў 1955 заатэхнічнага факультэта**

| № | Прозвішча, імя, імя па бацьку | Год нараджэння | Месца нараджэння, нацыянальнасць | Папярэдняе навучанне |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Аніська Яўген Мікалаевіч | 4.04.1930 г. | в. Навасёлкі, Роскі с/с Ваўкавыскага р-на Гродзенскай вобл. Беларус. | У 1950 г. скончыў беларускую Роскую с/ш. У 1950-1951 гг. студэнт заатэхнічнага факультэта БСГА |
| 2. | Асіноўская (Леванец) Яўгенія Паўлаўна | 1930 г. | г. Трубчэўск, Бранскай вобласці Руская. | У 1950 г. скончыла Трубчэўскую с/ш № 2. У 1950-1953 гг. студэнтка заатэхнічнага факультэта БСГА |
| 3. | Баркоўская Тамара | 28.01.1931 г. | в. Лукаўцы, Шчэпіцкі с/с Клецкага р-на | У 1950 г. скончыла рускую Клецкую с/ш. |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | Адамаўна | | Баранавічскай вобл. Полька. | У 1950-1951 гг. студэнтказаатэхнічнага факультэта БСГА |
| 4. | Голубева Антаніна Іванаўна | 1924 г. | в. Белаўка, Варатынскі р-н Горкаўскай вобласці Руская. | У 1942 г. скончыла Варатынскую с/ш. У 1942-1946 гг. студэнтка заатэхнічнага фак-та Горкаўскага сельскагаспадарчага інстытута. |
| 5. | Марчанка Аляксандр Мацвеевіч | 25.05.1931 г. | в. Папоўцы, Пабалоўскі с/с Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл. Беларус. | У 1950 г. скончыў Пабалоўскую с/ш № 4. У 1950-1951 гг. студэнт заатэхнічнага фак-та Херсонскага сельскагаспадарчага інстытута. |
| 6. | Рыдак Павел Аляксандравіч | 25.05.1930 г. | в. Брыкаўшчына, Зубкоўскі с/с Клецкага р-на Баранавіцкай вобл. Беларус. | У 1950 г. скончыў Клецкую с/ш № 1. У 1950-1951 гг. студэнт заатэхнічнага факультэта БСГА |
| 7. | Тузаў Сяргей Іванавіч | Снежань 1929 г. | г. Мінск. Рускі. | У 1950 г. скончыў Мінскую с/ш № 10. У 1950-1951 гг. студэнт заатэхнічнага факультэта БСГА |
| 8 | Тузава (Ваўчок) Марыя Іванаўна | 6.03.1930 г. | в. Яжэвічы, Шчэпіцкі с/с Клецкага р-на Баранавічскай вобл. Беларуска. | У 1950 г. скончыла Клецкую с/ш № 1. У 1950-1951 гг. студэнтка заатэхнічнага факультэта БСГА |
| 9. | Хрушчова Праскоўя Сцяпанаўна | 1930 г. | в. Кірылаўка, Чуровіцкі с/с Бранскай вобл. Руская. | У 1950 г. скончыла Каменска-Хутарскую с/ш Чуровіцкага раёна. У 1950-1952 гг. студэнтка заатэхнічнага фак-та Валагодскага малочнага інстытута. |
| 10. | Шаўчук Міхаіл Дзмітрыевіч | 16.02.1931 г. | в. Папоўцы, Пабалоўскі с/с Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл. Беларус. | У 1950 г. скончыў Пабалоўскую с/ш № 4. У 1950-1951 гг. студэнт заатэхнічнага фак-та Херсонскага сельскагаспадарчага інстытута. |

***Крыніца:*** **Архіў УО "ГДАУ".**

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

**Табліца 2. Паіменны спіс выпускнікоў 1955 агранамічнага факультэта**

| № | Порозвішча, імя, імя па бацьку | Год нараджэння | Месца нараджэння, нацыянальнасць | Папярэдняе навучанне |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Бэгер Вера Кліменцеўна | 1931 г. | в. Варонічы, Селявіцкі с/с Слонімскага р-на Баранавічскай вобл. Беларуска. | У 1950 г. скончыла Азярніцкую с/ш. У 1950-1951 гг. студэнткаагранамічнага факультэта БСГА |
| 2. | Багданава Валянціна Якаўлеўна | 8.08.1921 г. | в. Воласава, Ленінградскай вобл. Руская. | У 1940 г. скончыла Аляксандраўскую с/ш, Ленінградскай вобл. У 1940-1941 гг. і пасля перапынку 1945-1946 гг. студэнткаЛенінградскага сельскагаспадарчага інстытута. У 1947-1948 гг. навучалася і скончыла Ваўкавыскае педвучылішча. |
| 3. | Сапітон(Глушчанка) Марыя Паўлаўна | 10.02.1930 г. | в. Іваноўка, Ануфрыеўскі р-н Кіравагradскай вобл. Украінка. | У 1950 г. скончыла с/ш працоўнай моладзі г. Горкі Магілёўскай вобл. У 1950-1951 гг. студэнткаплодаагародніцкага факультэта БСГА |
| 4. | Захарэвіч Уладзімір Андрэевіч | 1928 г. | в. Янава, Няклюдаўскі с/с Віцебскай вобл. Беларус. | У 1950 г. скончыў Смальянскі сельскагаспадарчы тэхнікум. У 1950-1951 гг. студэнт агранамічнага факультэта БСГА |
| 5. | Іваноў Анатоль Сямёнавіч | 1928 г. | г. Калінін Калінінскай вобл. Рускі. | У 1945 г. скончыў Калінінскуюс/ш № 9. У 1949-1951 гг. студэнт агранамічнага факультэта Ленінградскага сельскагаспадарчага інстытута. |
| 6. | Ігнаценка Іван Якаўлевіч | 1913 г. | Невядомы населены пункт у Генеральскім с/с Радзівона-Несветаеўскім раёне Растоўскай - на - Доне вобл. Рускі. | У 1940 г. скончыў вячэрнее аддзяленне рабфака. У 1940-1941 гг. студэнт-завочнік гістарычнага аддзялення Рагачоўскага настаўніцкага інстытута. У 1948-1951 гг. студэнт-завочнік гістарычнага факультэта Баранавіцкага |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | | дзяржаўнага педагагічнага інстытута. |
| 7. | Лаўрусенка Анатоль Іванавіч | 1929 г. | г.п. Хойнікі Палескай вобл. Беларус. | У 1949 г. скончыў Хойніцкую с/ш. У 1950-1951 гг. студэнт агранамічнага факультэта БСГА |
| 8. | Бекрень (Ластаўка) Раіса Аляксееўна | 1929 г. | в. Астраўкі, Бярэзінскага раёна Мінскай вобл. Беларуска. | У 1950 г. скончыла Сялібскую с/ш Бярэзінскага раёна Мінскай вобл. У 1950-1953 гг. студэнткаагранамічнага факультэта БСГА |
| 9. | Новікаў Аляксей Данілавіч | 6.02.1931 г. | в.Лугаўцы, Смаленскага раёна Смаленскай вобл. Руская. | У 1949 г. скончыў Катынскую с/ш Смаленскага раёна Смаленскай вобл. У 1950-1951 гг. студэнт агранамічнага факультэта БСГА |
| 10. | Тамчук Ніна Рыгораўна | 1927 г. | в. Андрыянкі, Беластоцкай вобл. Беларуска. | У 1950 г. скончыла Міжабласную вочна-завочную с/ш г. Гродна. У 1950-1951 гг. студэнткаплодаагародніцкага факультэта БСГА |
| 11. | Часноўскі Станіслаў Антонавіч | 6.05.1929 г. | в. Малая Капліца Путрышкаўскі с/с Гродзенскага раёна Гродзенскай вобл. Паляк. | У 1950 г. скончыў с/ш працоўнай моладзі № 1 г. Гродна. У 1950-1951 гг. студэнт агранамічнагафакультэта БСГА |
| 12. | Шаршнёў Канстанцін Андрэевіч | 22.04.1930 г. | в. Тур'я Клясінскі с/с Краснапольскага раёна Магілёўскай вобл. Беларус? | У 1950 г. скончыў Клясінскую с/ш Краснапольскага раёна Магілёўскай вобл. У 1948-1949 гг. студэнт Харкаўскага аўтамабільна-дарожнага інстытута. У 1950-1951 гг. студэнт-завочнікплодаагародніцкага факультэта БСГА |

***Крыніца:*** **Архіў УО "ГДАУ".**

***Высновы.*** Стварэнне ў Гродна сельскагаспадарчага інстытута было важным этапам у развіцці акадэмічнай культуры Гродзеншчыны. Першы выпуск ГСГІ быў плёнам працы сельскагаспадарчых інстытутаў Беларусі, Расіі і Украіны. Сціплы старт 1955 г. быў толькі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

пачаткам планамернай і маштабнай падрыхтоўкі кадраў для вытворчасці і навукі краіны.

КРЫНІЦЫ

1. Гродненский государственный аграрный университет, 1951-2001. 50 лет. Гродно, 2001.
2.ALMAMATER: Гродненский государственный аграрный университет. Традиции, история, современность. Гродно, 2011.
3. Архіў УО "ГДАУ". Асабістыя справы студэнтаў заафака і аграфака выпуску, 1955 г. Спр. № 3.

УДК 37(091):37.013.32:929

## ВЗГЛЯДЫ М.М. РУБИНШТЕЙНА НА ПЕДАГОГИЧЕСКУЮ ПРАКТИКУ

**А.Ю. Грахоцкая**
УО «Гомельский государственный университет имени Франциска Скорины» (Республика Беларусь, 246028, г. Гомель, ул. Советская, 102; e-mail:ermolchik1992@mail.ru)

Аннотация. В статье рассматриваются взгляды М.М. Рубинштейна на педагогическую практику. Автор приходит к выводу, что учёный внёс существенный вклад в формирование модели педагогической практики студентов советских вузов, определил основные задачи педагогической практики, описал ключевые составляющие успешной организации практической подготовки студентов, а также выделил ключевую роль учителя-предметника в процессе руководства практикой.
Ключевые слова: М.М. Рубинштейн, педагогическая практика, учитель, практикант, дневник практики.

## VIEWSM.M. RUBINSTEINFORPEDAGOGICALPRACTICE.

**A.Yu. Grachotskaya**
FranciskSkorinaGomelStateUniversity (Belarus, 246028, Gomel, Sovetskayast., 102; e-mail: ermolchik1992@mail.ru)
Summary.The article deals with the views of M.M. Rubinshtein for pedagogical practice. The author comes to the conclusion that the scientist made a significant contribution to the formation of a model of pedagogical practice for students of Soviet universities, identified the main tasks of pedagogical practice, described the key components of the successful organization of practical training for students, and also highlighted the key role of a subject teacher in the process of managing practice.
Key words: MM. Rubinshtein, pedagogical practice, teacher, trainee, practice diary.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ